ВЕРЫНА ДАРОГА

Вера ХОЎРАТ марыла стаць кіроўцам. Мара спраўдзілася пасля нараджэння дзяцей. У яе іх — васьмёра! Цяпер Вера працуе шафёрам пасажырскага аўтобуса на маршруце Жодзіна — Мінск. Ёй трыццаць сем гадоў.

«Раней я працавала малодшай медсястрой у аперацыйнай вайсковага шпіталя. Калі ж праявілася алергія на медыкаменты, была вымушана сысці. Спачатку мы з мужам не планавалі шмат дзяцей, але ў нас нарадзілася шасцёра хлопчыкаў і дзве дзяўчынкі», — расказвае гэтая рухавая жанчына пра павароты свайго лёсу.

Яшчэ падчас дэкрэтнага Вера скончыла аўташколу і атрымала правы. Думала пайсці працаваць у тралейбуснае дэпо ў Мінску, але даведалася, што зноў зацяжарыла. І мара стаць кіроўцам была адкладзена на пэўны час. Вера Хоўрат расказала, што калі прыйшла ўладкоўвацца ў аўтапарк, дзе цяпер і працуе, то хвалявалася: думала, што яе могуць не ўзяць. Але ўсё склалася найлепшым чынам — так, як хацелася.

Вера Хоўрат жыве з сям'ёй недалёка ад Мінска ў вёсцы Слабада, яны маюць дом, куды Вера заўсёды спяшаецца пасля рэйса да сваіх родных.

Таццяна ТКАЧОВА, фота аўтара.

Смалявіцкі раён.

Больш здымкаў глядзіце на сайце «Звязды».